

# Сіманоўскі
## Іосіф Бенцыянавіч

(12 [25] крас. 1892 – 8 кастр. 1967) – вядомы савецкі бібліятэказнаўца, бібліёграф і арганізатар бібліятэчнай справы ў Беларускай ССР.

Працаваў дырэктарам Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя У. І. Леніна ад самага яе заснавання. Пад кіраўніцтвам І. Б. Сіманоўскага бібліятэка вырасла ў буйнейшае кнігасховішча і цэнтр бібліятэказнаўчай і бібліяграфічнай работы ў рэспубліцы.

І. Б. Сіманоўскі заўсёды ўдзельнічаў у пастаноўцы і рашэнні карэнных пытанняў бібліятэчнай справы ў БССР – клапаціўся аб расшырэнні бібліятэчнай сеткі ў рэспубліцы, падрыхтоўцы кадраў, быў адным з арганізатараў бібліятэчнага факультэта пры Мінскім педагагічным інстытуце імя А. М. Горкага.

Савецкі Урад высока ацаніў заслугі І. Б. Сіманоўскага, узнагародзіўшы яго двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга (у 1932 і 1949 г.г.), медалем „За доблестный труд в Великой Отечественной войне". У 1957 г. яму прысвоена званне заслужанага работніка культуры Беларускай ССР.

Рашэннем пашыранага паседжання мясцкома ад 8 жніўня 1972 года за доўгую і бездакорную працу ў Дзяржаўнай бібліятэцы БССР імя У. І. Леніна і ў азнаменаванне 50-годдзя з дня яе заснавання І. Б. Сіманоўскі занесена ў Кнігу Народнай Славы бібліятэкі.